# ПРЫГАЖЭЦЬ ЗЯМЛІ САЛІГОРСКАЙ



Вось ён, самы юны горад рэспублікі—Салігорск. Усяго пяць год назад прыйшлі сюды будаўнікі, а цяпер жыллёвы фонд яго ўжо складае 80 тысяч квадратных метраў.

Фота В. ДУБІНКІ.

☆☆

## У ГЭТЫ ТЫДЗЕНЬ ПЯЦЬ ГАДОЎ НАЗАД

● Адначасова з рамонтам шасэ Слуцк-Старобін пачалося будаўніцтва 32-кіламетравага чыгуначнага пуці і дарогі ад Слуцка да будаўнічай пляцоўкі і к будучаму гораду.

Зараз на адрамантаванай дарозе праз кожныя дзве гадзіны курсіруе невялікі аўтобус Слуцк—будпляцоўка — Старобін.

● Першы дом—сабе! Зусім недалёка ад запаветнага каменя закладзенага горада пачалося будаўніцтва інтэрната на 56 месц.

● Першачарговы аб'ект—прамысловая пляцоўка. У гэтыя дні сюды паступае абсталяванне для завода жалезабетонных вырабаў. Тут будзе ўзведзена воданапорная вежа і збудавана кацельня магутнасцю 5.000 кілаграмаў пары ў гадзіну.

● Адбыўся першы адкрыты камсамольскі сход у комплекснай брыгадзе Івана Сергіені. Створана пярвічная камсамольская арганізацыя.

## РАСЦЕ НАШ ГОРАД ЮНЫ


М. УЛАСАЎ,
намеснік сакратара парткома будтрэста № 3


☆☆

Сваё пяцігоддзе салігорцы сустракаюць выдатнымі працоўнымі перамогамі. Пяць год для маладога горада — тэрмін невялікі. Але многае зроблена за гэты час. У 1958 годзе ў жыллёвым фондзе пасёлка не было ні аднаго квадратнага метра. Будаўнікі жылі ў палатках, уладкоўваліся на кватэры ў дамах калгаснікаў. А сходы праводзілі пад адкрытым небам.

Салігорск юны, усё ў яго ў перспектыве. Шматпавярховыя жылыя дамы, выдатнае вадасховішча. Горад ужо набывае прыгожы выгляд. Шырокаэкранны кінатэатр і клуб будаўнікоў, горнахімічны тэхнікум, дзве школы, магазіны, камбінат бытавога абслугоўвання, шэсць сталовых, дзіцячыя сады і яслі — усё да паслуг салігорцаў.

Народжаны сямігодкай, ён кожны дзень расце і прыгажэе, расшырае свае межы. Для салігорцаў што ні дзень, то прыемная папраўка ў жыцці. Закладзен новы дом, адкрыт новы маршрут аўтобуса, новая вуліца, заканчваецца будаўніцтва новай школы. І наваселлі, наваселлі... Ужо сёлета ў эксплуатацыю здадзена восем шматкватэрных дамоў. Салігорцы атрымалі 12 тысяч квадратных метраў жылля. Дзве кватэры кожны дзень. Нядрэнна! У кожнай — электрычнасць, вада, газ. А да канца гэтага года яшчэ 700 сем'яў справяць наваселлі. Цяпер жыллёвы фонд горада налічвае 80 тысяч квадратных метраў. Ужо 300 вяселляў згулялі маладыя гараджане, нарадзілася 820 хлопчыкаў і дзяўчынак.

І самае галоўнае — людзі выпрацоўваюць у сабе камуністычную свядомасць, крынічную чысціню думак, вялікую ўпартасць, волю, багацце і жыццё рабочае і гордае.

Ведаюць салігорцы Леаніда Якубава як вопытнага арганізатара. Ён узначальвае брыгаду, якая ў ліку першых на будоўлі заваявала званне калектыву камуністычнай працы, з гонарам носіць імя партызана Івана Чуклая. Не адзін будынак узведзен гэтым дружным калектывам. Ёсць чаму павучыцца ў калектываў брыгад, якія ўзначальваюць Аляксандр Арабіна, Іван Паддубіцкі, Анатоль Бялько і многія іншыя. Усё больш людзей на будоўлі выпрацоўвае ў сабе новыя маральныя якасці, новыя рысы характару. Кожны цяпер зразумеў, што стаць грамадзянінам першага ў свеце камуністычнага грамадства, — гэта не толькі вялікае шчасце, але і высокі гонар. На будаўніцтве 19 калектываў удастоена звання камуністычных, 82 калектывы змагаюцца за гэтае званне.

Радавы рабочы, машыніст горнапраходчага камбайна Леанід Адамавіч Булгак прадстаўляе беларускіх шахцёраў у савецкім парламенце, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР выбран дырэктар першага калійнага камбіната Мін Паўлавіч Белапухаў. Камсамолкі Жэня Луганцова і Аляксандра Савасцянава — дэпутаты абласнога прамысловага Савета дэпутатаў працоўных. 79 перадавікоў вытворчасці з'яўляюцца дэпутатамі гарадскога Савета.

Здадзены калійшчыкам новыя прамысловыя аб'екты першага калійнага камбіната: ствол № 2, капёр шахты № 1, у напружанай працы нараджаецца галоўны корпус абагачальнай фабрыкі. Паспяхова вядзецца будаўніцтва другога калійнага камбіната.

...Ёсць у клубе будаўнікоў два шчыты, на якіх намаляваны будучы камбінат і горад. А пакуль што — вакол разрытая зямля будаўнічых пляцовак. Але мы бачым наш горад такім, які ён будзе: новыя мікрараёны ў зеляніне прыродных масіваў, залітыя сонцам і адлюстраваныя воднай гладдзю вадасховішча.

**САЛІГОРСКУ 5 ГОД**